Joanna Wasiluk

# Образ селяніна ў поэмах Вінцэся Каратынскага і Янки Лучины ("Тамила" і "Паляўнічыя акварэлькі з Палесся")

Acta Polono-Ruthenica 21, 281-292

2016

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

ISSN 1427-549X

Joanna Wasiluk
Uniwersytet w Białymstoku

# Вобраз селяніна ў паэмах Вінцэся Каратынскага і Янкі Лучыны (*Таміла* і *Паляўнічыя акварэлькі з Палесся*)

Увага да селяніна, яго праблем актывізуецца ў беларускай літаратуры з пачатку XIX стагоддзя. Просты чалавек пераважна не задумваўся над пытаннямі сваёй нацыянальнай прыналежнасці, сацыяльнага ці палітычнага становішча краю. Аднак сама рэчаіснасць, рух эканамічных фармацый абумоўлівалі зрухі ў грамадскай свядомасці. На жаль, адмена прыгоннага права ў 1861 годзе няшмат змяніла ў лёсе большасці сялян, што абвострана адчувалася лепшымі прадстаўнікамі тагачаснай беларускай інтэлігенцыі, сапраўднымі патрыётамі.

Розніца і падабенства ў тэматычным абсягу, галоўных матывах, урэшце творчым метадзе асэнсавання жыццёвага матэрыялу польска-беларускімі паэтамі Вінцэсем Каратынскім і Янкам Лучынам у значнай ступені вызначаюцца агульнасцю і адрозненнем іх жыццёвых біяграфій. Адзін з паходжання – наднёманскі селянін, другі – інтэлігент, мінчанін, але абодвух іх хваляваў лёс селяніна.

Вінцэсь Каратынскі (1831–1891) належыць да нешматлікай кагорты прадстаўнікоў сялянства сярэдзіны XIX стагоддзя, якія шчаслівым збегам абставін мелі магчымасць засвоіць здабыткі элітарнай шляхецкай культуры і стаць вядомымі людзьмі таго часу. Янка Лучына (Ян Неслухоўскі, Іван Неслухоўскі) (1851–1897) паходзіў са старадаўняга шляхецкага роду, атрымаў добрую адукацыю ў Мінску і Пецярбурзе. Абодва пісалі на беларускай і польскай мовах.

У паэме *Таміла* (1858) В. Каратынскі паспрабаваў паказаць уласную версію рэчаіснасці, адрозную ад варыянтаў пісьменнікаў шляхецкага паходжання, у тым у ліку Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. У адрозненне ад В. Дуніна-Марцінкевіча, які ў сваіх творах найперш аптымістычна спадзяецца на паразуменне паміж добрым панам і селянінам, мастацка-эстэтычнае адлюстраванне рэчаіснасці, канцэптуальны погляд на яе ў В. Каратынскага

вельмі песімістычныя. У наднёманскага паэта няма асветніцкіх ілюзій, уласцівых В. Дуніну-Марцінкевічу, ў дарэформеннай творчасці якога прасочваецца вернасць асветніцкім канонам.

Эмацыянальным штуршком для напісання *Тамілы*, відаць, было пачуццё пратэсту супраць агульнапрынятага і непрымаемага Каратынскім стаўлення да сялянства. Можна меркаваць, што Каратынскі імкнуўся паказаць абразок з народнага жыцця як своеасаблівую ілюстрацыю да ўласных эстэтычных поглядаў. Ён лічыў, што „творчасць – гэта лінза, што кандэнсуе промні думак сучаснага яму свету”[1]. Галоўны герой паэмы мае ўласнае імя і з’яўляецца прадстаўніком пэўнага, сялянскага саслоўя. У вобразе селяніна Тамілы паэт раскрывае вобраз беларуса дарэформеннага часу, працавітага гаспадара, маральна трывалага чалавека, вартага лепшай долі. Аднак, загнаны ў кут несправядлівасцю, пазбаўлены волі, галоўны герой выступае ў якасці ахвяры неспрыяльных абставін, як бесхарактарная асоба.

Пачатак паэмы арганізуецца радасцю і светлай тугой лірычнага героя пры вяртанні ў родныя мясціны. „Дзякаваць Богу! Хоць клопат вярэдзіць,/ Ды я ўсё ж вярнуўся да ніў прадзядоўскіх” (115). Вітаецца ён шчыра з Нёманам – сваім сябрам ад маленства, прынёманскай вёскай, з зялёнымі нівамі. Свет не змяніўся, вёска, як і раней, „зрошвае потам надзеі палоскі, а зло не знікае [...]”. Як зло акрэсліваюцца сацыяльная несправядлівасць, здзек над чалавекам працы, вечны голад:

Голад спрадвеку,
З якім тут цярпліва абвыкліся знацца,
І розум, і сілы, і цягу да працы –
Усё адбіраў пакрыху ў чалавеку. (121)

Гнецца як і раней „над плугам мужых гэтаксама” (115). Лірычны герой бачыць знаёмыя дрэвы, буслянкі, крынічку, але ўжо „другая па воду збягае дзяўчына”, „равеснікаў многіх зямліца пакрыла” (116). Таміла адзначае, што сяляне ўвесь час спадзяюцца на паляпшэнне свайго становішча, высільваючыся на полі:

Тую ж тут сеюць надзею на ўдачу,
А жнуць, як і некалі, марнасць надзеі. (117)

[1] В. Каратынскі, *Творы*, укл. прад. У. Мархеля, Мінск 1994, с. 177. Далей пры спасылцы на гэтае выданне ў дужках падаецца старонка.

І ўрэшце даводзіцца ім „посціць сем пятніц на тыдні” (121), але гэта не дэфармуе іх пашанотных адносін да зямлі, да хлебаробчай працы:

Спакой табе, праца, мазолі цяжкія!
Спакой табе, ніва, загон узараны!
Спакой у імя ўсеагульнай пашаны. (117)

Таміла адчувае сваю сыноўнюю зрошчанасць з неўраджайнай роднай зямлёй, што выяўляецца ў разгорнутай метафары:

На лобе маім рала здоўжаных летаў
Барозны кладзе, як на вашых прасторах. (115)

Пасля лірычнага зачыну паэт знаёміць чытача з галоўным героем паэмы. Вось стары Таміла, насунуўшы „на вушы шапку з аўчыны,/ дзіравую світку на спіну” (120), арэ, сее поле. Падганяе спрацаванага, стомленага, як і сам, каня. Ён шчыра спачувае жывёліне:

Жвавей жа, Пярэсты, мой конік аддапы!
Закончым араць, адпачнем абое,
Тады напаю ўжо крынічнай вадою
І сенам цябе накармлю я духмяным. (119)

Год выдаўся неўраджайным. Стары пазычыў вясною ў пана насенне, а восенню разлічыцца няма чым. Таміла пахаваў сына і жонку і застаўся на старасці з клопатам пра малалетніх унукаў. Няшчасці сыплюцца на старога адно за другім, выйсця ён не знаходзіць. Некалі ж Таміла быў першым гаспадаром у ваколіцы, яго багаццю зайздросцілі, шапталіся, што ён чароўнік. Пісьменнік паказвае ненадзейнасць, крохкасць сялянскага шчасця. Ад былога заможжа ў селяніна не засталося нічога.

З унукамі беднасць прыйшла на астатак,
Расселася ў хаце і з’ела ўсё скора:

Гумно як падмецена, пуста ў каморы
І хлеба апошні ўжо бохан пачаты;
Сабака, і кот, і Пярэсты, вядома –
Увесь твой набытак. (120)

Дастатак і гаспадарка сплылі, як яго маладосць і сіла, але ж не прагуляў іх Таміла. Нават пан у час размовы з селянінам адзначае, што той

„працуе крывава, як вол у ярме", што „не траціць налева, направа" (129). Але Тамілу няма чым плаціць, няма чаго везці ў горад на продаж. Па загаду пана яму трэба прадаць каня. Будуць грошы аддаць доўг і пракарміцца да вясны. Слёзы наплываюць на яго вочы, калі ён думае пра сваю апошнюю надзею – коніка. Сляза – кроў душы ад цярновых калючак. Таміла просіць літасці ў пана: ідзе зіма, не будзе чым дроў прывезці дахаты, вясною не будзе як працаваць на полі і памруць яго маленькія ўнукі з голаду. Але пан з усмешкай адказвае, што „ў жылах у хлопа/ агню ёсць нямала" (129). Нездарма Таміла яшчэ ў хаце вельмі перажывае сустрэчу з панам. Сама думка аб спатканні будзіць у ім прадчуванні аб ліхім: „здранцвеў неяк, роспаччу скуты,/ Знявага душы або целу пакуты". Хаця гаварылі, што цяперашні пан не такі сярдзіты, „ды памяць пра злое – то ж памяць на векі!" (124).

Таміла сваё бядотнае жыццё тлумачыць лёсам, вышэйшай прадвызначанасцю, з чым змагацца немагчыма. Вярнуўшыся ад пана з рашэннем прадаць каня, ён „доўга стаяў утрапёны, без думкі, без плачу" (130). Цярпліва зносячы ўдары лёсу, селянін можа наракаць толькі на долю:

Ох, долечка ж наша, адкуль ты паслана?
І пану пакрыўдзіць мяне нецікава,
І ў вёсцы шкадуюць усе маіх дзетак;
Здаецца, працую – з-пад рук уцякае...
Ды што тут чыніць, калі суджана гэтак. (130)

Свае стасункі ў аўтара паэмы і з Богам. Яго герой – веруючы чалавек, дзякуе Богу, моліцца яму, часта хрысціцца, „як маці навучала яго шчэ малога" (123). Таміла не ставіць пад сумненне парадкі на свеце: „Ці ж гэта папраўдзе патрэбна ўсё Богу? Не нам дапытацца..." (130). Аўтар жа паказвае, што боскай воляй тлумачыць свае няшчасці як Таміла, так і пан, калі адмаўляе скрыўджанаму жыццём селяніну. „Ды цяжка змяніць, што назначана... Богам" (129), – гаворыць ён у сваё апраўданне.

Горад агаломшыў старога, чалавечы натоўп „папхнуў, закружыў і панёс яго ў тлуме". На гэты тлум і мітусню са стромай гары горада пазірае замак з Міндоўгавай вежай, які многа пабачыў на сваім вяку. Ён памятае мінуўшчыну. Сучаснасць, у параўнанні з ёй, здрабнела і змізарнела. Селяніну горад атаясамліваецца з амаральнасцю, п'янствам: „карчомкі часцей, а крыжы парадзелі" (135), здзекам:

Едзе цівун, што пачаў ад'ядацца,
Ці пан аканом, што ніяк не ад'есца,
Ці добра-такі ўжо ад'еты пан радца. (135)

В. Каратынскі паказвае, што простыя людзі са страху перад уладай ставяць Бога і пана побач. Не адрозніваюць вышыні і значэння Госпада ад фігуры пана:

Панок або крыжок – а люд утрапёны
Аднолькава нізка схіляе галовы
І адбівае пакорна паклоны
Прад панам сусвету і панам вясковым. (135)

Старому селяніну яго конік, безадказны памочнік і таварыш, сведка ўсіх няшчасцяў, што абрынуліся ў апошнія гады на яго, здаецца бясцэнным („золатам можна асыпаць такога" [140]). Аднак пакупнікі і проста гледачы „знаходзяць не вартасці – бачаць заганы" (140) каня. Урэшце Таміла прадаў Пярэстага цыганам, а на заканчэнне ў карчме папалам па закону быў выпіты барыш. Наіўнага, п'янага селяніна абакралі. Тамілу няма з чым вяртацца дамоў, дзе чакаюць галодныя ўнукі.

У многіх аўтарскіх адступленнях таксама гучыць думка пра наканаванасць лёсу, пра спрадвечную несправядлівасць на зямлі, і вывад, што „свет на асновах сваіх пахіснуты" (118). Шляхоў, каб змяніць становішча народа, В. Каратынскі не бачыў, таму столькі скрухі і гаркоты ў яго разважаннях пра жыццё чалавека працы:

Свіцяца аконцы, як воўчыя вочы,
Чорнае вёскі, як лес яе чорны,
У хатках прыгорбленых, цемрай засланых,
Нахіленых долу маўкліва, пакорна,
Як спіны сялян перад воблікам пана
І думкі зацягвае цемра такая ж [...]. (121)

Пачуцці сялян, схаваныя ад чужога, параўноўваюцца В. Каратынскім у паэме з конікам, шчасліва ўкрытым ў траве. Аўтар гаворыць:

Не раз зняважаныя крыўдаю злою,
Яны пацішэлі пад дошкай грудною. (131)

Так, просты народ прывык да несправядлівасці і здзерства. Лепш цішэй сядзець у сваёй гнілай хаце, чым голасна дамагацца лепшай будучыні:

Добра б, каб мы ўсе аглухлі, аслеплі,
Бо чорт які ўчуе, з даносам папрэцца. (149)

Страх перад панамі адбірае ў сялян надзею на годнае і справядлівае жыццё.

Трагічны лёс Таміды паказаны праз вяртанне ў мінулае краіны (аповед пра разбурэнне татарамі касцёла і гераічную перамогу хрысціян [126]), праз зварот да народных паданняў беларусаў (пра пачвару-кабету [152], пра старога чараўніка [157]), да прытчаў (пра мучэнне ката [122]), а таксама праз маральнасць беларускага народнага светабачання. Як паэт-селянін, Каратынскі добра ведаў рэальнае жыццё прыгоннай вёскі, але ў творчасці ён так ці інакш мусіў арыентавацца на літаратурныя густы адукаванай шляхецкай аўдыторыі. Такая дваістасць падказвала неабходнасць выпрацоўкі пэўнага спосабу выказвання. Каратынскі спачуваў свайму герою – Таміле, перажываў разам з ім нястачы і безвыходнасць. Але разам з тым „прымушаў яго прайсці праз ланцуг фатальных выпрабаванняў”[2]. „Як ніхто з сучаснікаў, – заўважае даследчык Ігар Запрудскі, – ён адлюстраваў сялянскае жыццё, якое ведаў не ў знешніх праявах, а ва ўнутранай сутнасці, спазнанай на ўласным вопыце”[3].

Вялікую ролю ў стварэнні вобраза беларуса, акрэсліванні нацыянальных рысаў яго характару напрыканцы XIX стагоддзя адыграў Янка Лучына. Зварот пісьменнікаў канца XIX стагоддзя да вобраза селяніна быў абумоўлены не толькі патрэбай часу, але, як гэта відаць і ў паэзіі Я. Лучыны, захапленнем творчасцю папярэднікаў. Менавіта творчасць лірніка вясковага Уладзіслава Сыракомлі была вельмі блізкай сэрцу як Янкі Лучыны, так і Вінцэся Каратынскага. Лірнік вясковы, як адзначае У. Мархель, „імкнуўся паказаць высокія маральныя якасці простага чалавека, апяваў яго сумленнасць і дабрыню, мудрасць і спагадлівасць, схіляў чытача да думкі, што сапраўдная высакароднасць уласціва якраз простанароддзю, а ў паноў яна ўяўная, і ставіў тым самым пытанне аб правах абяздоленых на роўнасць і зямное шчасце”[4].

---

[2] І. Запрудскі, *Стратэгія ўзаемадзеяння аўтар-чытач у творчай спадчыне В. Каратынскага*, [у:] *Вінцэсь Каратынскі ў беларуска-славянскім літаратурным узаемадзеянні*, с. 118.

[3] Ibidem, с. 119.

[4] У. Мархель, *Творчасць Уладзіслава Сыракомлі*, Мінск 2005, с. 47–48.

Найзначным творам Я. Лучыны з'яўляецца польскамоўная паэма *Паляўнічыя акварэлькі з Палесся*, якая цалкам адпавядае беларускаму культурнаму канону. У творы расказваецца пра жыццё і побыт беларускага народа, а галоўным героем яе з'яўляецца просты беларускі селянін, ляснік Грышка, які ўсімі сваімі клопатамі і справамі непарыўна звязаны з роднай зямлёй і акаляючай прыродай. Я. Лучына багата карыстаецца ў творы беларускай гаворкай, лексікай і фразеалогіяй.

У вобразе лесніка Грышкі паэт раскрывае жывы нацыянальны характар беларуса, чалавека разумнага, па-народнаму вынаходлівага. Так, у адзін момант ён стварае з кавалка бярозы клічку на ласёў. У лясной пушчы Грышка адчувае сябе як у сваёй хаце. Прырода і звычаі, звязаныя з паляваннем, паказаны ў розныя поры года як, напрыклад, на куццю. Стары паляўнічы дасканала ведае кожную мясціну, звычкі звяроў і птушак, уважлівы да кожнага руху і гуку прыроды.

Я. Лучына адзін з першых у новай беларускай літаратуры ў такой ступені апаэтызаваў прыгажосць роднай прыроды:

Прыгожы, некрануты край перада мною,
Чарот бязмежны, пушча з сіняй глыбінёю,
Дзе хвой выносістых завершаны стажок,
Як галаву, траха пасерабрыў сняжок. (40)

У паэме Я. Лучыны лес-аазіс[5] мае такую самую вартасць для беларускага селяніна як зямля ў творы В. Каратынскага. Для Грышкі прырода з'яўляецца „ідэалам гармоніі, як існасць быцця"[6], хаця варта ўзгадаць, што і ў *Таміле* прырода называецца роднай маці[7]. Палеская пушча выяўляе жывую, духоўную існасць прыроды. Яна ў сваёй шматстайнасці набывае эстэтычную каштоўнасць, ачышчае і ўзвышае чалавека:

Як сэрца раптам цяжкай сціснецца тугой,
Яго суцешыць пушчы шум над галавой. (81)

Стары Грышка не хоча мірыцца з новымі парадкамі: чаму праз яго роднае Палессе будзе праведзена чыгунка?! Ён баіцца, што знішчыцца цудоўная палеская прырода, знікне звер, „памрэ павольным сконам зубра

[5] G. Górski, *Narracja w „Akwarelkach myśliwskich z Polesia" Jana Niesłuchowskiego*, „Acta Albaruthenica. Literatura, język, kultura: tradycje i współczesność", Warszawa 2011, nr 11, s. 71.

[6] Л. Уладыкоўская-Канаплянік, *Акварэлі любові*, Мінск 2000, с. 105.

[7] В. Каратынскі, *Творы*, укл. прад. У. Мархеля, с. 131.

ў Белавежы” (37), а таксама згінуць на Палессі „памяткі князёў, тых Рурыка нашчадкаў” (37).

Стары адчувае, што змяняюцца і адносіны паміж людзьмі, якія раней жылі згодна з прыродай, з народнымі звычаямі і абрадамі. Я. Лучына, як і жыхары не толькі Палесся, але і цэлай Беларусі, балюча ўсведамляў няўхільнае разбурэнне адвечных беларускіх традыцый, аднак перамены немагчыма было затрымаць.

Прызнанне паэта, што сюжэт паэмы быў узяты з яго уласных назіранняў, сведчыць пра аўтабіяграфічнасць твора. Магчыма, у вобразе паніча, які ходзіць з ахвотай на паляванне з лесніком, увасоблены сам паэт. На летнія і зімовыя канікулы студэнт І. Неслухоўскі заўсёды прыязджаў да бацькоў – у Менск ці Мархачоўшчыну, тую самую, якую раней, яшчэ ў 30-я гады, арандаваў бацька У. Сыракомлі. Апрача палявання Лучыну цікавіла таксама рыбалка. У паэме ён стварыў цудоўную карціну, у якой паяднаны і грэчаская міфалогія, і еўрапейская культура, і народны фальклор:

З лучынай яснаю на чоўне калыўным,
Нібы Нептун з трызубам, з восценем даўгім
Плыве адважны сын Палесся, вёскі ўбогай,
Не ўвекавечыў пэндзаль Рэмбранта такога,
У мроку пры святле лучыны век-вяком
Здаецца духам чалавек, вадзяніком. (58)

Я. Лучына падкрэсліваў у лістах да Зянона Пшасмыцкага, што яго *Акварэлькі* былі не вынікам фантазіі, а тварыліся ў адпаведнасці з жыццёвай праўдаю: „яны арыгінальныя і праўдзівыя, як фатаграфія, бо спісаны яны з сапраўдных факцікаў” (183). Пейзаж і этнаграфічныя дэталі побыту простых людзей, а таксама паказ галоўнага героя ў розных абставінах пацвярджаюць, „што ў адлюстраванні жыццёвых з’яў Лучына не адрываўся ад рэальнай глебы і што ў самім характары выбару матэрыялу з рэчаіснасці, самой манеры падачы вобразных малюнкаў ён прытрымліваўся ў *Паляўнічых акварэльках* рэалістычнага спосабу ўзнаўлення пазнаных ім бакоў жыцця Беларусі[8]. Абодва пісьменнікі карысталіся рэалістычным падыходам да рэчаіснасці і тым самым паказалі іншыя вобразы сялян, адпаведныя перыяду жыцця аўтараў – селяніна сярэдзіны і канца XIX стагоддзя.

[8] У. Мархель, *Крыніцы памяці*, Мінск 1990, с. 163.

У характары і паводзінах старога паляўнічага прываблівають высокая маральнасць, сумленнасць і спагадлівасць. Грышка – гэта ўжо чалавек з пачуццём уласнай годнасці. Ён часта дакарае маладога паніча, які, на яго думку, не адпаведна паводзіць сябе ў пушчы. Такім чынам, Лучынаў герой мае ўжо адвагу навучаць панскае дзіця, не баіцца глянуць яму проста ў вочы. Ён вучыць паніча любіць усё жывое, не забіраць без патрэбы нічыё жыццё (*раздзел Першае маё паляванне на ласёў*), паважаць хлеб і даражыць ім (раздзел *Голад*). Што ж тычыцца палявання, то тут стары Грышка ўвогуле непераўзыдзены знаўца. Паніч згаджаецца са старым, што ў лапцях латвей хадзіць па снезе, што нельга курыць у лесе, бо звер адыдзе, калі пачуе непрыемны пах. Ляснік вучыць гарадскога хлопца быць цярплівым, паслядоўным у выкананні сваіх намераў. Пры тым Лучынаў селянін мае адвагу таксама спагадліва падсмейвацца над панічом, калі той не патрапіць ціха захоўвацца ў лесе і ўпускае звера:

Ласі не верабейкі, паўтару шчэ раз,
Ад сораму згарэць, як уцякуць з-пад носу.
А Божа ж мой! Паніч якую стрэльбу носіць!
Цьфу! З руляў нешта сыплецца, пабач, само. (39)

Нельга рвацца наперад, не ведаючы, што там чакае: „Поспех людзям на смех” (40) – вучыць стары паляўнічы. Грышка адважна, не так як паніч „Дрыжэў увесь, нібы кісель аўсяны” (53), раіць шляхце і службоўцам слухаць яго і бярэ на сябе ролю кіраўніка аблавай на ваўкоў. Селянін стаіць на нагах упэўнена, цвёрда, з узнесенай высока галавой. Стары ўспамінае таксама калі-нікалі ранейшыя часы, калі просты чалавек быў прыніжаным слугой пана, які адбіраў у яго апошні кавалак хлеба. На зыходзе стагоддзя характар беларускага селяніна прыкметна эвалюцыяніруе.

Я. Лучына стварае рэалістычны вобраз беларускага селяніна канца XIX стагоддзя, мудрага, настойлівага, але і з уласцівымі яму слабасцямі. Ідучы на паляванне, стары заклапочаны, каб толькі не сустрэцца з жанчынай, што абазначае няўдачу на паляванні: „Не стрэлі бабы – удача будзе адмысловай” (39). Ён не любіць гаварыць пра злых духаў і д’яблікаў, якія жывуць у пушчы і дакарае пана, які, ведаючы пра гэту слабасць Грышкі, падбівае яго на такія размовы. Людзі, выхаваныя ў гарадах, не вераць у прыкметы і магічную сілу з’яў прыроды. Стары зазначае, што можа ў горадзе людзі і мудрэйшыя, але толькі тут, на вёсцы, чалавек адчувае сябе вольным, жвавейшым і шчаслівейшым. Вера ў прыкметы ніяк не перашкаджае Грышку цвяроза і крытычна думаць і адпаведна паводзіць

сябе ў жыцці. На паляванні ён различвае не на добрых або злых духаў, а толькі на ўласную кемлівасць і вынаходлівасць, а часам і сілу. У многіх эпізодах мы бачым Грышку як сапраўднага чалавека-асілка, моцнага не толькі фізічна, але і сваёй народнай мудрасцю, развжлівасцю, вопытам. Паэт скіроўвае галоўную ўвагу чытача на душэўны стан селяніна Грышкі. Ён, нягледзячы на сваю пэўную ўжо нямогласць, звязаную са старасцю, здолеў высачыць і забіць велізарнага мядзведзя, які прыносіць шкоду аднавяскоўцам. Гэта справа яго гонару і абавязку, гэта ўрэшце магчымасць сцвердзіць сябе.

Аналізуючы *Паляўнічыя акварэлькі з Палесся*, Л. Уладыкоўская-Канаплянік адзначае: „Нацыянальны светапогляд выявіў сябе праз увасабленне ў мастацкіх вобразах беларускага нацыянальнага светаадчування, светабачання, светаразумення – праз той глыбокі грунт нацыянальнага светапогляду, які цяжка знішчаецца стагоддзямі”[9]. Вобразам Грышкі Лучына ўзнёс хвалу чалавеку-працаўніку, апаэтызаваў яго сілу і душэўную прыгажосць. Я. Лучына супастаўляе беларускага мужыка з антычнымі, традыцыйна высокімі персанажамі як роўнага з роўнымі:

Я дзёрся праз кусты, разносіліся ўдары,
Яшчэ нябожчыка [ваўка] ўсё Грышка кіем жарыў,
Чыніў з ахвяры здзек, як анямеў быў лес,
Як з трупа Гектара калісьці Ахілес. (50)

Паэт не толькі паказаў таленавітага, сціплага, мужнага, цярплівага чалавека, а зрабіў з яго сапраўданага героя канца XIX стагоддзя – апаэтызаваў беларускага селяніна.

Грышка ўздымаецца над героямі іншых твораў свайго часу шырынёй бачання рэчаіснасці, імкненнем спасцігнуць змены ў жыцці народа. Стары бачыць, што, дзе раней была аблога, разлеглася поле, гатовае да сяўбы, высушана балота, на якім расце буйная трава. Але цяжка яму пагадзіцца з новым краявідам, хоць і адчувае, што змены абавязковыя, непазбежныя. Праз некалькіх гадоў паніч прыязджае на Палессе і бачыць, што спраўджваюцца песімістычныя прадказанні старога паляўнічага. Прыгажосць прыроднага свету неразумна нішчыцца, багацце спусташаецца – над усім пануюць голы разлік і карысць. Апавядальнік-паніч вымушаны прызнаць:

[9] Л. Уладыкоўская-Канаплянік, *Акварэлі любові*, с. 53.

Ды што такое?... дзе лясы? Ці ж край той самы?
Хіба абшар вось той, пустэльня тая з пнямі
І ёсць Кругліца, дзе быў птушак спеў наўкол?...
Бярозы дзе шумелі, хвоі і асіны? (77)

Апошняе спатканне старога Грышкі і яго любімага паніча выклікае сум, але і роздум над будучыняй Палесся-Беларусі. Яны пры сваіх сустрэчах вучыліся адзін ад другога: стары, расказваючы, вучыў паніча любіць родны край, яго прыроду, шанаваць людзей працы, звычаі і абрады, яго „прыяціч" (78) паказваў яму ролю прагрэсу і навукі ў дасягненні лепшага, шчаслівейшага жыцця: „Абы нашчадак працавіты быў, сумленны" (80). Урэшце Грышка ў канцы паэмы паказваецца чалавекам, які разумее неабходнасць навукі, ведаў у жыцці народа, які з гэтым звязвае шчаслівую будучыню сваіх унукаў-беларусаў.

Творчасць Я. Лучыны сваімі тэмамі і вобразамі адлюстравала ментальнасць беларускага народа на мяжы стагоддзяў. Паэт, мабыць, разумеў, што нацыянальны характар беларуса раскрываецца не толькі праз этнаграфічна-бытавую сферу яго жыцця, але ў першую чаргу – праз паказ яго ўнутранага свету, успрыманне рэчаіснасці.

*Паляўнічыя акварэлькі з Палесся* Я. Лучыны, „сагу аб беларусах як свабодалюбівым і цярплівым народзе"[10], многія даследчыкі ставяць у адзін рад з выдатнымі творамі пра беларускі край і яго жыхараў: рэнесансавай *Песняй пра зубра* Міколы Гусоўскага і эпапеяй першай паловы XIX стагоддзя *Пан Тадэвуш* Адама Міцкевіча.

Дзевятнаццатае стагоддзе з'яўляецца для беларускай літаратуры перыядам узнікнення і фарміравання беларускай нацыянальнай ідэі, стварэння нацыянальнага характару беларуса. Характару, які традыцыйна атаясамліваўся і творча адлюстроўваўся дзякуючы вобразу селяніна, як творцы ўсяго нацыянальнага. Сапраўды, галоўным героем беларускай літаратуры ў XIX стагоддзі быў просты селянін. Галоўная заслуга творцаў гэтага перыяду заключалася ў тым, што яны з пачуццём вялікай адказнасці за будучыню народа ўздымалі ў сваёй творчасці праблему сацыяльнай несправядлівасці і адначасова выступалі супраць нацыянальнага прыгнёту беларускага народа. Менавіта „specyficzne odbicie w literaturze mentalności chłopskiej przyniosło w rezultacie i te elementy historycznie ukształtowane,

[10] Ibidem, s. 52.

które potwierdzały stopniowe dochodzenie chłopstwa do rozumienia spraw narodowych i potwierdzenia własnej odrębności społecznej”[11].

„Chłopstwo, – сцвярджае Юзаф Хлябоўчык, – to potencjalna baza społeczna procesu narodotwórczego”[12]. Паэты В. Каратынскі і Я. Лучына бачылі ў сялянах прыхаваную мужнасць і ўнутраную прыгажосць. Яны імкнуліся высветліць маральныя якасці чалавека працы, узвысіць яго сумленнасць і працавітасць, паказаць, што праўдзівай высакароднасцю надзелены якраз просты народ, які таксама заслугоўвае зямнога шчасця. Творчы метад абодвух паэтаў, адпаведна селяніна і інтэлігента, быў блізкі рэалістычнаму асэнсаванню рэчаіснасці.


## Streszczenie

*Obraz chłopa w poematach Wincentego Korotyńskiego i Janki Łuczyny („Tomiło" i „Akwarelki myśliwskie z Polesia")*

Głównymi bohaterami dzieł Wincentego Korotyńskiego i Janki Łuczyna byli ludzie prości, chłopi – twórcy i nosiciele podstawowych pierwiastków narodowych. Ludzie prości posługiwali się językiem białoruskim, kultywowali zwyczaje i obrzędy przodków, na co dzień korzystali z mądrości ludowych, zaczerpniętych z folkloru. Korotyński w poemacie *Tomiło* dążył do ukazania mentalności tych ludzi i stawał w ich obronie. Łuczyna w utworze *Akwarelki myśliwskie z Polesia* ukazał pozytywny wizerunek Białorusina schyłku XIX, określił cechy narodowe jego charakteru. Wgłębiając się w duszę prostego człowieka, jego świat wewnętrzny, mówiąc o jego przeżyciach, uczuciach i zmartwieniach, poeta poruszał w swoich utworach problemy społeczno-narodowe.

Obaj pisarze, przedstawiając w poematach różne oblicza chłopa białoruskiego, byli bliscy realistycznego ukazania jego rzeczywistości.



## Summary

*The image of peasant in poems of Wincenty Korotyński and Janka Łuczyna („Tomiło" i „Akwarelki myśliwskie z Polesia")*

The main heroes of Wincenty Korotyński and Janka Łuczyna's works were simple people, peasants – authors and bearers of main national elements. Just these people spoke Belorussian, they cultivated customs and rituals of their ancestors. They used folk-wisdom in their everyday life. W. Korotyński in *Tomiło* aspired to show mentality of working people, who also deserved for better lot. J. Łuczyna in *Akwarelki myśliwskie z Polesia* showed positive image of Byelorussian people of decline of XIX century, determined national features of their character. Delving in a simple man's soul, his internal world, saying about his experience, feelings and troubles the poet showed social and national problems in his works.

Both writers were close to realistic showing the reality, but they showed different faces of byelorussian peasant in their works of the middle and end of XIX century.


**Key words:** Byelarussian literature of XIX century, realizm, picture of the Byelarussian people, byelorussian peasant, poems of XIX century.